# ЦЯПЕР — САПРАЎДНЫЯ СТУДЭНТЫ!

**У Доме афіцэраў прайшла ўрачыстая інаўгурацыя — пасвячэнне першакурснікаў у студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

У цырымоніі пасвячэння ўдзельнічалі такія героі, як Францыск Скарына і Магістр Культуры. Пасля наказу выпускніка ўніверсітэта першакурснікі далі ўрачыстую клятву, якую замацаваў гімн студэнцтва — «Гаўдэамус».

У святочным канцэрце бралі ўдзел лепшыя калектывы БДУ культуры і мастацтваў.

Іскрынкай канцэртнай праграмы было выступленне лаўрэата міжнароднага фестывалю «Славянскі базар у Віцебску», салісткі Нацыянальнага канцэртнага аркестра пад кіраўніцтвам М. Фінберга — Ганны Благавай. Яна парадавала гледачоў, прадставіўшы на іх суд у якасці падарунка прэм'еру аўтарскай песні «Проста восень». Пасля заканчэння інаўгурацыі кожнага навfaспечанага студэнта БДУ культуры і мастацтваў можна было пазнаць па гордай хадзе і бляску ў вачах.

**Святлана КАМЕНДАНЧЫК.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ